# КАМПАЗІЦЫЯ

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**1.1.** Мэта экзамену — выяўленне здольнасцей і схільнасцей абітурыентаў да творчай і праектнай дзейнасці.
**1.2.** Заданне: стварэнне дзвюх кампазіцый з выкарыстаннем зададзеных элементаў па тэмах: «Тэхнічны аб’ект», «Дэкаратыўны ўзор», «Чалавек», «Пейзаж», «Фармальная кампазіцыя».
**1.3.** Тэмы кампазіцый вызначае камісія перад экзаменам.
**1.4.** Для практычнага выканання кампазіцый па выбранай тэматыцы ўсім абітурыентам выдаецца па 2 аркушы паперы фармату А4. На пярэдні бок папярэдне нанесены друкаваным спосабам агульная для ўсіх сістэма розных па размяшчэнні, велічыні і канфігурацыі ліній. У сістэме гэтых ліній абітурыент павінен знайсці мастацка-графічныя сродкі для інтэрпрэтацыі выбранай тэмы.
**1.5.** Усе экзаменацыйныя работы выконваюцца простым графітным алоўкам з прымяненнем любых тэхнічных прыёмаў, з выкарыстаннем розных відаў і формаў стылізацыі і графічнай умоўнасці малюнкаў. Важна, каб усё гэта адпавядала агульнай праектна-творчай задуме і мастацка-кампазіцыйнаму ўвасабленню сэнсавай інтэрпрэтацыі прадметнага зместу выбранай тэмы.
**1.6.** На экзамене пры сабе неабходна мець: алоўкі графітныя (НВ, В, 2В, 4В і г. д.), сцірку, разрэзаную па дыяганалі. Выкарыстанне лінейкі не дапускаецца.
**1.7.** Экзамен праводзіцца ў адзін дзень на працягу 5 акадэмічных гадзін:

- выбар тэматыкі, абдумванне і творчы пошук варыянтаў вобразнага рашэння — 1 акадэмічная гадзіна (45 хвілін);
- графічнае выкананне першай кампазіцыі — 2 акадэмічныя гадзіны (90 хвілін);
- графічнае выкананне другой кампазіцыі — 2 акадэмічныя гадзіны (90 хвілін).

## 2. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ

**2.1.** Работы ацэньваюцца па наступных крытэрыях:

- адпаведнасць марфалогіі элементаў і графічнай структуры малюнка ў цэлым асаблівасцям аб’ектыўнага зместу выбранай тэмы — 3 балы;
- лагічная абгрунтаванасць і візуальная арганічнасць уключэння зададзенай сістэмы ліній у агульную структуру кампазіцыйнага рашэння — 3 балы;
- адпаведнасць работы агульным прынцыпам мастацка-кампазіцыйнай арганізацыі выяўленчага матэрыялу на плоскасці — 2 балы;
- неабходная і дастатковая ступень прапрацоўкі элементаў кампазіцыі і графічная культура яе выканання ў цэлым — 1 бал;
- арыгінальнасць праектна-творчай задумы і адэкватнасць яе наглядна-вобразнага ўвасаблення ў характары пабудовы кампазіцыі — 1 бал.

**2.2.** Максімальная колькасць балаў, якую можна атрымаць за кожную работу — 10 балаў.

**2.3.** Пры падвядзенні вынікаў балы пераводзяцца ў адзнакі:

- 10 балаў — выдатна
- 9 балаў — вельмі добра
- 8 балаў — добра
- 7 балаў — пасрэдна
- 6 балаў — здавальняюча
- 5 балаў — слаба
- 4 балы — нездавальняюча
- 3 балы — дрэнна
- 2 балы — вельмі дрэнна
- 1 бал — зусім дрэнна

**2.4.** Адзнакі за першую і другую кампазіцыю сумуюцца, і выстаўляецца сярэдняя адзнака.

## 3. РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЫКАНАННЯ КАМПАЗІЦЫІ

**3.1.** Рэкамендаваная літаратура:

- Чарнышоў А. В. Фармальная кампазіцыя. Творчы практыкум. — Мн.: «Харвест», 1999.
- Чарнышоў А. В. Прынцыпы пабудовы ўступнага экзамену па дызайне: Навучальна-метадычны дапаможнік для выкладчыкаў і абітурыентаў. — Мн.: ЕГУ, 2001.

## 4. ПРЫКЛАДЫ РАБОТ ПА КАМПАЗІЦЫІ

У дадзеным раздзеле прыведзены прыклады работ мінулых гадоў,
каб наглядна прадэманстраваць, як прымяняюцца крытэрыі ацэньвання, указаныя вышэй.

Паўтарэнне дадзеных работ або асобных пазнавальных элементаў пры выкананні кампазіцыі
ў бягучым годзе будзе ацэнена нездавальняюча.

### 4.1. Прыклад удалай работы. Тэма «Пейзаж»



Ацэнка работы:

- Адпаведнасць марфалогіі элементаў і графічнай структуры малюнка зместу выбранай тэмы — 3 балы. Выбранае кампазіцыйнае і графічнае рашэнне адпавядае зададзенай тэме.
- Лагічная абгрунтаванасць і візуальная арганічнасць уключэння зададзенай сістэмы ліній у агульную структуру кампазіцыйнага рашэння — 3 балы. Лініі арганічна ўключаны ў прадстаўленае кампазіцыйнае рашэнне.
- Адпаведнасць работы агульным прынцыпам мастацка-кампазіцыйнай арганізацыі выяўленчага матэрыялу на плоскасці — 2 балы. У дадзенай кампазіцыі ўсе элементы арганічна звязаны паміж сабой; ясна пазначаны кампазіцыйны цэнтр, кампазіцыя ў дастатковай ступені выразная.
- Неабходная і дастатковая ступень прапрацоўкі элементаў кампазіцыі і графічная культура яе выканання ў цэлым — 1 бал. Усе элементы прапрацаваны ў дастатковай ступені для выканання пастаўленай задачы.
- Арыгінальнасць праектна-творчай задумы і адэкватнасць яе наглядна-вобразнага ўвасаблення ў характары пабудовы кампазіцыі — 1 бал. Дадзеная работа можа разглядацца як арыгінальная ў плане выбранай тэхнікі выканання.

**ВЫНІК: 10 балаў**

## 4.2. Прыклады няўдалых работ. Тэма «Партрэт»

**Ацэнка работы 1:**



- Адпаведнасць марфалогіі элементаў і графічнай структуры малюнка зместу выбранай тэмы — 0 балаў. Дадзеную работу немагчыма трактаваць як партрэт, бо адсутнічаюць характэрныя для партрэта акцэнты на псіхалагічных, сацыялагічных або прафесійных якасцях суб'екта, які адлюстроўваецца.
- Лагічная абгрунтаванасць і візуальная арганічнасць уключэння зададзенай сістэмы ліній у агульную структуру кампазіцыйнага рашэння — 0 балаў. Лініі неарганічна ўключаны ў прадстаўленае кампазіцыйнае рашэнне. Пра гэта сведчаць дзве папярочныя лініі, якія ні кампазіцыйна, ні графічна не абгрунтаваны.
- Адпаведнасць работы агульным прынцыпам мастацка-кампазіцыйнай арганізацыі выяўленчага матэрыялу на плоскасці — 2 балы. У дадзенай кампазіцыі ўсе элементы звязаны паміж сабой; прысутнічае кампазіцыйны цэнтр, кампазіцыя ў дастатковай ступені выразная.
- Неабходная і дастатковая ступень прапрацоўкі элементаў кампазіцыі і графічная культура яе выканання ў цэлым — 1 бал. Усе элементы прапрацаваны ў дастатковай ступені для выканання пастаўленай задачы.
- Арыгінальнасць праектна-творчай задумы і адэкватнасць яе наглядна-вобразнага ўвасаблення ў характары пабудовы кампазіцыі — 1 бал. Дадзеная работа можа разглядацца як арыгінальная.

**ВЫНІК: 4 балы**

**Ацэнка работы 2:**



- Адпаведнасць марфалогіі элементаў і графічнай структуры малюнка зместу выбранай тэмы — 3 балы. Не ўзнікае ніякіх сумненняў у тым, каб разглядаць дадзеную работу як партрэт.
- Лагічная абгрунтаванасць і візуальная арганічнасць уключэння зададзенай сістэмы ліній у агульную структуру кампазіцыйнага рашэння — 0 балаў. Лініі неарганічна ўключаны ў прадстаўленае кампазіцыйнае рашэнне. Пра гэта сведчаць ссунутыя вусны, лінія ў вобласці носа ніяк не ўдзельнічае ў кампазіцыі.
- Адпаведнасць работы агульным прынцыпам мастацка-кампазіцыйнай арганізацыі выяўленчага матэрыялу на плоскасці — 1 бал. У дадзенай кампазіцыі ўсе элементы звязаны паміж сабой; прысутнічае кампазіцыйны цэнтр, аднак кампазіцыя невыразная.
- Неабходная і дастатковая ступень прапрацоўкі элементаў кампазіцыі і графічная культура яе выканання ў цэлым — 1 бал. Усе элементы прапрацаваны ў дастатковай ступені для выканання пастаўленай задачы.
- Арыгінальнасць праектна-творчай задумы і адэкватнасць яе наглядна-вобразнага ўвасаблення ў характары пабудовы кампазіцыі — 0 балаў. У дадзенай рабоце няма ні арыгінальнага рашэння тэмы, ні кампазіцыйнага, ні графічнага рашэння.

**ВЫНІК: 5 балаў**

## 4.3. Прыклады ўдалых кампазіцыйных рашэнняў











